*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
29
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 16 (1354)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### ДНІ ФІЗІКА

прайшлі ва універсітэце. Праведзены студэнцкая навуковая канферэнцыя, прэс-канферэнцыя з выкладчыкамі. Больш 200 першакурснікаў былі пасвечаны ў студэнты. На свята прыехалі студэнты з Масквы, Краснадара, Гродна.

**І. РЫГОРАЎ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

### УДЗЕЛЬНІК

Вялікай Айчыннай вайны С. С. Сяргеенка па запрашэнню аддзела абслугоўвання універсітэцкай бібліятэкі і грамадскіх арганізацый факультэта быў госцем студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта прыкладной матэматыкі.

**І. БАРДЗІЯН,**
**студэнтка журфака.**

### АГЛЯД ТВОРЧАСЦІ

агітбрыгад лінейных СБА адбыўся на філфаку. Сярод разнастайных кампазіцый, з якімі выступалі будатрадаўцы, найбольш вызначылася праграма, прысвечаная Эрнеста Чэ Гевара — ганароваму байцу будатрада «Медыум» (камандзір В. Лаўшова, камісар А. Малахаў), які будзе прадстаўляць філфак на універсітэцкім аглядзе агітбрыгад СБА.

**І. ПАПУРЭНКА,**
**студэнтка філфака.**

### КНІЖНАЯ ВЫСТАЎКА

«Рэдкія выданні У. І. Леніна ў фондзе бібліятэкі БДУ» экспанавалася на філфаку і на кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў у час работы канферэнцый, прысвечаных 112-й гадавіне з дня нараджэння правадыра.

**А. СІНКЕВІЧ,**
**загадчыца аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі.**

### ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

з беларускім пісьменнікам, крытыкам, драматургам, вучоным, аўтарам вядомых кніг «Я з вогненнай вёскі», «Хатынская аповесць», «Вайна пад стрэхамі», «Сыны ідуць у бой» А. Адамовічам адбылася на факультэце журналістыкі. Ён расказаў аб рабоце над сваімі творамі, падзяліўся уражаннямі ад паездак за мяжу, адказаў на пытанні слухачоў.

**І. ПАПКО,**
**студэнт журфака.**



Няхай жыве І Мая—Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных у барацьбе супраць імперыялізму, за мір, дэмакратыю і сацыялізм!

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1982 года).*

**ДА 60-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ СССР**

## ПАЕЗДКА НА ВІЦЕБШЧЫНУ

ТРАДЫЦЫЙНЫМІ і карыснымі для навуковай і выкладчыцкай дзейнасці членаў кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна сталі выязныя выступленні і пасяджэнні кафедры перад самымі разнастайнымі аўдыторыямі рэспублікі. У Салігорску і Мядзелі, Слоніме і Магілёве выступалі вучоныя перад калгаснікамі, рабочымі, настаўнікамі, вучнямі, інтэлігенцыяй; вялі гаворку пра дасягненні нашай нацыянальнай культуры і навукі, пра інтэрнацыянальную еднасць народаў СССР, пра задачы вышэйшай і сярэдняй школы ў святле рашэнняў XXVI з'езда партыі. Нядаўна група супрацоўнікаў кафедры вярнулася з Віцебска. Паездка была арганізавана сумесна з Таварыствам «Веды» і прысвячалася 60-годдзю ўтварэння Савецкай дзяржавы, а таксама 100-гадоваму юбілею Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Народныя песняры былі звязаны з зямлёй і людзьмі Віцебшчыны. Тутэйшыя краявіды захаплялі сваёй прыгажосцю Янку Купалу. Яго радавалі поспехі калгаснікаў Аршаншчыны, дзе ён быў не проста госцем, а паўнапраўным удзельнікам усіх будняў і свят. У Ляўках нарадзіўся і выдатны цыкл вершаў даваеннай пары, вядомы пад назвай ляўкоўскага. Прэм'ера п'есы Якуба Коласа «Вайна — вайне» адбылася ў Віцебскім тэатры пры непасрэдным удзеле аўтара.

Пра спадчыну народных пісьменнікаў Беларусі, пра іх грамадзянскае і чалавечае аблічча, гуманістычны, інтэрнацыянальны пафас іх творчасці вялася размова выкладчыкамі універсітэта ў віцебскіх аўдыторыях. Дэлегацыю БДУ ўзначальвала загадчыца кафедры беларускай літаратуры, заслужаны работнік вышэйшай школы дацэнт В. В. Казлова. Перад віцябчанамі выступілі таксама літаратуразнаўца і паэт, прафесар А. А. Лойка, даследчык беларускай літаратуры дацэнт В. П. Рагойша, дацэнт універсітэта, літаратуразнаўца М. Б. Яфімава, аспірантка кафедры Л. Корань. У рабоце групы ўдзельнічала метадыст Рэспубліканскага Таварыства «Веды» А. Г. Мурнева.

Вучоныя універсітэта выступілі перад студэнтамі і выкладчыкамі педагагічнага інстытута, актывам прафсаюзных работнікаў Віцебскай вобласці, перад настаўнікамі Віцебшчыны, калектывам завода электра-вымяральных прыбораў, рабочымі чыгуначнага дэпо, перад членамі таварыства кнігалюбаў завода тэхналагічнага абсталявання і перад работнікамі гэтага завода. Выкладчыкі сустрэліся са сваімі выхаванцамі, выпускнікамі філалагічнага факультэта; арганізавалі для іх кансультацыі па гісторыі беларускай літаратуры, па методыцы выкладання ў сярэдняй і вышэйшай школе. Група наведала гістарычныя мясціны Віцебшчыны, звязаныя з падзеямі Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, узбагаціла свае веды фактычным матэрыялам аб жыцці і дзейнасці шматлікіх пратэтыпаў літаратурных герояў, ушанавала памяць людзей, якія аддалі сваё жыццё за росквіт Саюза ССР.

**Л. ДЗМІТРЫЕВА.**

## «МОЙ РОДНЫ КРАЙ—БЕЛАРУСЬ»

ГЭТЫ ГОД — год вялікага свята нашага народа і краіны, які таксама шчасліва аказаўся і годам стогадовых юбілеяў Купалы і Коласа. Гэта супадзенне тым больш раднасае, што вялікія народныя песняры ў сваёй творчасці і ў грамадскай дзейнасці былі палымянымі прапагандыстамі дружбы народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы.

Ні з чым нельга параўнаць тую велічную заваёву, якой з'яўляецца дружба народаў Краіны Саветаў, што жывуць адзінай шматнацыянальнай сям'ёй, маюць неабмежаваныя магчымасці для палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця. Без гэтага Савецкая Беларусь не змагла б дасягнуць таго, што мае.

Аб усім гэтым расказалі студэнты геаграфічнага факультэта на сваёй канферэнцыі «Мой родны край — Беларусь», прысвечанай 60-годдзю ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Канферэнцыю адкрыў дэкан геаграфічнага факультэта Мікалай Тарасавіч Раманоўскі. Ён прадставіў госця — выпускніка БДУ імя У. І. Леніна, зараз намесніка дырэктара навукова-даследчага інстытута геалогіі АН БССР Аляксандра Уладзіміравіча Тамашэвіча. А. У. Тамашэвіч расказаў аб інтэнсіўным даследаванні і разведцы нядраў нашай рэспублікі. Цёпла і сардэчна прынялі студэнты выступленне ганаровага госця.

Вынікі канферэнцыі падвяла загадчыца аддзела масавай работы бібліятэкі Раіса Іосіфаўна Ляховіч.

**Н. ПРЫМАКА,**
**метадыст аддзела масавай работы бібліятэкі.**

● ТРЫБУНА ПАРТОРГА

# ПАРТЫЙНАЕ ДАРУЧЭННЕ

У СТАТУЦЕ КПСС запісана палажэнне аб тым, што «членам КПСС можа быць любы грамадзянін Савецкага Саюза, які прызнае Праграму і Статут партыі, актыўна ўдзельнічае ў будаўніцтве камунізму, працуе ў адной з партыйных арганізацый...»

У развіцці вытворчай і грамадскай актыўнасці камуністаў важную ролю адыгрываюць партыйныя даручэнні. Што ж такое партыйнае даручэнне, што складае гэта шматграннае паняцце?

Пад партыйным даручэннем прынята разумець грамадскую работу, якую праводзяць камуністы ў палітычных, вытворча-эканамічных, культурных і іншых інтарэсах партыйнай арганізацыі, калектыву, грамадства наогул.

Па свайму зместу партыйныя даручэнні — гэта заданні, якія даюцца непасрэдна партыйным органам, партыйнай арганізацыяй. Партыйнае даручэнне камуністу можа быць дадзена сакратаром партыйнай арганізацыі ў аператыўным парадку.

Партыйнае даручэнне — магутны сродак выхавання, прыцягнення чалавека да грамадскіх спраў. У кожным калектыве такіх спраў шмат, і кожнаму камуністу заўсёды знойдзецца занятак. Так, на кожным факультэце нашага універсітэта існуе шмат розных грамадскіх фарміраванняў. Гэта камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, добраахвотныя народныя дружыны па ахове грамадскага парадку, пярвічныя арганізацыі Таварыства «Веды», ДТСААФ, Чырвонага Крыжа, «Буравесніка», аховы прыроды і г. д. І ўсе гэтыя арганізацыі працуюць пад накіроўваючым уздзеяннем партыйных арганізацый факультэтаў, камуністаў, якія з'яўляюцца членамі гэтых фарміраванняў.

У партыйнай арганізацыі юрыдычнага факультэта дзвесце семдзесят камуністаў. Гэта дазваляе партыйнай арганізацыі праз сваіх членаў ахопліваць партыйным уплывам усе грамадскія фарміраванні, якія існуюць на факультэце. Партыйнае бюро факультэта, партыйныя групы (а іх на факультэце трынаццаць) клапоцяцца аб тым, каб кожны камуніст меў партыйнае даручэнне (пастаяннае ці часовае), каб ён прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Партыйнымі даручэннямі ахоплены камуністы-выкладчыкі і камуністы-студэнты.

Абавязковай і першай умовай пры размеркаванні партыйных даручэнняў з'яўляецца глыбокае, усебаковае веданне кожнага камуніста, спецыфічных рысаў яго характару, яго здольнасцей і вопыту. Напрыклад, партыйнае бюро многія гады даручае камуністам — прафесарам С. Г. Драбязка і А. В. Дулаву кіраўніцтва работай тэарэтычных семінараў выкладчыкаў, камуністам дацэнту А. Я. Глебаву і В. С. Ямеліну — кіраўніцтва работай школ маладых камуністаў. Студэнты-камуністы А. Войцік, В. Калмычкова, М. Міхалап, В. Фамін, якія валодаюць арганізатарскімі здольнасцямі і маюць схільнасць да камсамольскай работы, выкарыстоўваюцца для работы ў камітэце камсамола, штабе працоўных спраў; студэнты-камуністы Г. Грынкевіч, Г. Кулага, А. Матулькоў выкарыстоўваюцца для работы па кіраўніцтву спартыўнай работай.

Асаблівую ўвагу мы ўдзяляем партыйным даручэнням маладых камуністаў. Чым актыўней малады камуніст удзельнічае ў рабоце партыйнай арганізацыі, тым хутчэй ідзе працэс фарміравання яго як палітычнага байца партыі. Для нашай партыйнай арганізацыі работа з маладымі камуністамі — прадмет асаблівага клопату, бо трэцяя частка ўсіх камуністаў факультэта мае стаж да трох гадоў.

Партыйнае бюро імкнецца да таго, каб кожны камуніст добрасумленна, з душой, творча выконваў партыйныя даручэнні. З гэтай мэтай на партыйных сходах, на пасяджэннях партыйнага бюро заслухоўваюцца справаздачы камуністаў аб выкананні патрабаванняў Статута КПСС, а таксама грамадскіх даручэнняў. Практыка такіх справаздач пераконвае нас у тым, што справаздача камуніста з'яўляецца важным фактарам павышэння яго авангарднай ролі. Патрэбна таксама сказаць і пра тое, што павышаецца адказнасць не толькі ў таго, хто дае справаздачу на сходзе партгрупы, пасяджэнні партыйнага бюро ці на партыйным сходзе.

Прывіваючы членам КПСС густ да грамадскай работы, партыйная арганізацыя дапамагае тым самым камуністам вучыцца актыўна ўздзейнічаць на жыццё калектыву факультэта, дапамагае заняць дастойнае месца ў агульнай рабоце, якую праводзіць пярвічная партыйная арганізацыя.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**сакратар партыйнага бюро юрыдычнага факультэта, дацэнт.**

● НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

# «Першы ўзлёт зрабілі ў нас...»

**На пытанні нашага карэспандэнта адказвае дырэктар падрыхтоўчых курсаў пры БДУ імя У. І. Леніна Аляксандр Анісімавіч ПАПЛЫКА.**

**— Якія задачы пастаўлены перад падрыхтоўчымі курсамі?**

— Курсы рыхтуюць слухачоў для паступлення ва універсітэт па ўсіх спецыяльнасцях. Навучанне праводзіцца без адрыву ад вытворчасці. Пачынаюцца заняткі першага кастрычніка. На вячэрніх курсах тэрмін навучання дзевяць месяцаў, на завочных — дзесяць. Слухачы-вячэрнікі наведваюць лекцыі і практычныя заняткі, а слухачы-завочнікі выконваюць кантрольныя работы па дысцыплінах, якія вынесены на ўступныя экзамены.

Мы пасылаем усім, хто займаецца ў нас, падручнікі, экзаменацыйныя праграмы, метадычныя распрацоўкі, кантрольныя работы. У ліпені з тымі, хто паспяхова выканаў усе нашы заданні, тут, у БДУ, праводзяцца выніковыя заняткі.

Да педагагічнай работы на курсах прыцягваюцца кваліфікаваныя выкладчыкі універсітэта, настаўнікі сярэдніх школ і іншых навучальных устаноў. У мінулым годзе ў нас працавала 116 выкладчыкаў (сярод іх 10 кандыдатаў навук).

Штогод абнаўляюцца рабочыя праграмы курсаў, распрацоўваюцца і друкуюцца метадычныя ўказанні, кантрольныя заданні.

Па нашых падліках, кожны чацвёрты наш слухач становіцца першакурснікам.

**— Што робіцца, каб большая частка вашых слухачоў паступіла ва універсітэт?**

— З гэтай мэтай супрацоўнікамі і выкладчыкамі курсаў разам з прыёмнай камісіяй праводзіцца вялікая прафарыентацыйная работа. Па-першае, мы ўвялі ў сваю практыку больш дыферэнцыраваныя тэрміны навучання. З мінулага года пачалі працаваць у дадатак да існуючых яшчэ чатырохмесячныя вячэрнія і пяцімесячныя завочныя курсы. Гэта дало магчымасць павялічыць колькасць навучэнцаў амаль на 30 працэнтаў, што, у сваю чаргу, дапаможа выбраць больш здольных абітурыентаў. З кожным годам расце колькасць дзяўчат і юнакоў, якія займаліся ў нас і паступілі ва універсітэт. Мы ганарымся сваімі выхаванцамі, якія расправілі крылы і натхнёна займаюцца навукай. Першы ўзлёт яны зрабілі ў нас.

Па-другое, немалую ролю адыгрывае рознабаковая своечасовая інфармацыя, якую мы рассылаем ва ўсе куткі Беларусі і бліжэйшыя раёны РСФСР, прыбалтыйскіх рэспублік, ва ўсе школы і на буйныя прадпрыемствы Мінска і Мінскай вобласці. Мы, як бачыце, не абмяжоўваемся толькі аб'явамі ў газетах.

Вырашыўшы паспяхова пытанне аб наборы, можна прыступіць і да арыентацыі слухачоў на выбраную спецыяльнасць, на тое, каб яны сталі абітурыентамі іменна БДУ.

Так, усе слухачы-вячэрнікі прысутнічалі на сустрэчах з дэканамі абраных факультэтаў. Апрача гэтага, непасрэдна ў групах часта праходзяць сустрэчы з выкладчыкамі і студэнтамі адпаведных факультэтаў.

**— Раскажыце аб цяжкасцях і перспектывах развіцця падрыхтоўчых курсаў.**

— Мы спадзяёмся павялічыць колькасць навучэнцаў ад 1500 да 2000, а паступіўшых — ад 700 да 1000. Перад намі стаіць шмат складаных пытанняў. Напрыклад, рашэнне праблем з засяленнем у інтэрнат нашых навучэнцаў у ліпені. Нам, каб выклікаць трэцюю частку лепшых слухачоў-завочнікаў, патрэбна 700 месц. У мінулым годзе студгарадок выдзеліў усяго 350. Не хапае аўдыторый. Раней мы займаліся ў адну змену, а вось летам 1981-га ледзь размясціліся ў дзве. Наспела патрэба праводзіць кансультацыі для слухачоў-завочнікаў больш часта і арганізавана. Дзеля гэтага прапанавана зрабіць іх у нядзелю, а не ў суботу, як было раней. Ёсць меркаванне, што лепшым нашым слухачам патрэбна выдаваць даведкі, якія прыкладваліся б да асабістай справы і давалі б нейкую перавагу пры роўнай колькасці балаў у час паступлення. Але гэта пытанне яшчэ канчаткова не вырашана.

● ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

# ФАКУЛЬТЭЦКІ ЗЛЁТ

ФАКУЛЬТЭЦКІ злёт будатрадаўцаў — мерапрыемства, яшчэ не традыцыйнае ва універсітэце — упершыню праведзены на факультэце прыкладной матэматыкі. Штаб працоўных спраў ФПМ распрацаваў палажэнне аб правядзенні злёту. Яго горача падтрымалі ўсе факультэцкія СБА, а таксама камітэт камсамола і спортбюро факультэта.

І вось па камандзе «смірна» застылі шарэнгі байцоў-будатрадаўцаў. Яркія, маляўнічыя эмблемы і плакаты калыша красавіцкі ветрык.

Калі ўсе 12 камандзіраў факультэцкіх будаўнічых атрадаў адрапартавалі аб гатоўнасці да злёту, сакратар камітэта камсамола ФПМ А. Сатолін уручыў граматы актывістам СБА, пераможцам у міжатрадаўскіх спаборніцтвах. Са шчырымі пажаданнямі поспеху да байцоў звярнуўся намеснік дэкана факультэта Г. П. Размысловіч. А затым пачаліся спартыўныя спаборніцтвы. Шмат гледачоў і балельшчыкаў сабралі перацягванне каната і падняцце гіры.

Працоўны дэсант байцоў СБА праходзіў на тэрыторыі інтэрната № 6. Яго змяніў агляд плакатаў па тэхніцы бяспекі і стэндаў аб ганаровым байцу атрада.

На ўрачыстай лінейцы былі падведзены вынікі злёту і ўручаны прызы. Пераможцамі сталі СБА «Ветразь» і «Алгарытм».

«Ветразь», зусім малады СБА на факультэце, робіць толькі першыя крокі на слаўным шляху будатрадаўскага руху. І крокі гэтыя ўдалыя. Сведчанне — першая перамога над такімі папулярнымі на ФПМ атрадамі, як «Пунсовыя ветразі» і «Сузор'е».

**А. КУЗНЯЦОВА,**
**студэнтка ФПМ,**
**баец СБА «Ветразь».**

# ЖЫВОЕ СЛОВА АБ ІЛЬІЧУ

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ на мінулым тыдні адбылася XXXIX студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 112-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 60-годдзю ўтварэння СССР.

На секцыі нямецкай мовы на хімічным факультэце прачыталі свае даклады студэнты Т. Монава (II курс), С. Сыракваш (II курс), Т. Булаш (I курс), А. Пазняк (II курс) і іншыя.

На пасяджэнне быў запрошаны ветэран рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, удзельнік штурма Зімняга, член КПСС з 1917 года Уладзімір Адамавіч Вавёраў. Прысутныя пачулі расказ аб цяжкай долі сялянства і рабочага класа да рэвалюцыі, аб рэвалюцыі 1905 года, аб сустрэчах з У. І. Леніным. У грамадзянскую вайну У. А. Вавёраў быў палітработнікам. У пасляваенны перыяд Уладзімір Адамавіч быў актыўным удзельнікам будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. У заключэнне У. А. Вавёраў пажадаў студэнтам новых поспехаў у вучобе, быць дастойнымі прадаўжальнікамі справы вялікага Леніна.

Хочацца падкрэсліць, што ў час падрыхтоўкі да канферэнцыі, студэнты хімфака пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры нямецкай мовы Л. В. Вянжыцкай арганізавалі выстаўку аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна.

**Т. БУЛАШ, А. ПАЗНЯК,**
**студэнткі хімфака.**





НА ЗДЫМКАХ: уважліва слухаюць студэнты выступленне У. А. Вавёрава.

# «Я русский бы выучил...»

СЯРОД замежных студэнтаў, якія навучаюцца на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, прайшоў конкурс на лепшае сачыненне аб У. І. Леніне. Шчыра і ўсхвалявана расказаў аб уплыве ідэй правадыра на моладзь сваёй краіны Бон Анэ Эмануэль з Конга. Аб тым, як звязваюць сваю гераічную барацьбу з імем Ільіча сальвадорскія камуністы, паведаміў Гарсіа Раберта Антоні. Палесцінец Аль Хаціб Набіль напісаў у сваім сачыненні аб тым, як аднойчы ў іх дом уварваліся сіяністы, якія шукалі яго старэйшага брата-камуніста. Пры вобыску былі знойдзены кнігі Леніна... Падзея гэта надоўга запала ў душу тады яшчэ зусім юнага Набіля. Прайшлі гады, і цяпер ён сам знаёміцца з творамі правадыра сусветнага пралетарыяту.

Як дарэчы ўспомніць тут радкі У. Маякоўскага: «Я русский бы выучил только за то, что им разговаривал Ленин».

**А. СЕНДЗЕР,**
**студэнт журфака.**

# СЛОВА—ЗА СПРАВАЙ

**ПА СЛЯДАХ СУМЕСНАГА ПАСЯДЖЭННЯ ПРАФКОМА, СТУДСАВЕТА ІНТЭРНАТА № 2, ПРАФБЮРО ФІЗФАКА І ЖУРФАКА.**

Гаварыць аб тым, што для многіх інтэрнат у студэнцкія гады стаў другім домам, здаецца, не патрэбна. Тут мы знаходзім новых сяброў, адпачываем, адзначаем дні нараджэння. Сюды вяртаемся пасля заняткаў, кіно, спатканняў.

У інтэрнаце № 2 жывуць студэнты двух факультэтаў: фізічнага і журналістыкі. Вядома, не абыходзіцца без праблем. Аб іх і ішла размова на чарговым пасяджэнні студэнцкага савета інтэрната, на якім прысутнічалі прадстаўнікі прафбюро абодвух факультэтаў і члены прафкома.

На парадку дня стаялі пытанні, якія хвалююць усіх студэнтаў: і праблема дзяжурства, і санітарны стан інтэрната, і культурна-выхаваўчая работа студсавета. Трэба было сур'ёзна падумаць і намеціць канкрэтныя шляхі змянення становішча, якое склалася ў інтэрнаце № 2.

Больш за ўсё разгарэлася спрэчак, калі загаварылі пра дзяжурства. Некалі было і такое, што цэлы тыдзень, дзень у дзень, збіралі студсавет і «разбіралі» тых, хто не выконвае абавязкі дзяжурнага. Але ўсё ішло па-ранейшаму. Было прынята рашэнне, якое абвяшчала: не з'явіўся на інструктаж — значыць, не дзяжурыў. Пры двух парушэннях дысцыпліны паведамлялася ў камітэт камсамола факультэта. Было рашэнне, але не было дзеяння. Узнікае пытанне: ці патрэбен інструктаж? Зразумела, тым, хто дзяжурыць першы раз, трэба ведаць меру сваёй адказнасці. Але навошта выслухоўваць правілы дзяжурства тым, хто не раз ужо дзяжурыў? Толькі дарэмна час губляецца.

Нягледзячы на тое, што ў інтэрнаце жывуць студэнты двух факультэтаў, студсавет тут створаны агульны. Цяпер паступаюць прапановы разбіць гэты студсавет на два. Ці патрэбна ў адзіным інтэрнаце двоеўладдзе? Ці не стануць журналісты і фізікі спіхваць адзін на аднаго свае праблемы? Што ўжо, на жаль, назіраецца.

У цяперашнім студсавеце працуе 17 чалавек. Яны ўваходзяць у састаў некалькіх камісій: жыллёва-бытавой, культурна-выхаваўчай, спартыўна-масавай, арганізацыйнай, санітарнай. У кожнай камісіі — тры-чатыры чалавекі. Але што яны робяць? Складваецца ўражанне, што кожны з іх глядзіць на другога і не вельмі імкнецца сам нешта вырашаць.

Але вернемся да пытання аб структуры студсавета. Староста адзінаццатага паверха Іосіф Шумскі прапанаваў: няхай старшынёй будзе фізік. Усё ж студэнтаў фізфака больш, чым журналістаў. А намеснікам па ідэйна-выхаваўчай рабоце выбраць студэнта журфака. У яго абавязкі ўваходзіў бы выпуск газеты, вядзенне культурна-масавай работы...

Журналісты часта праводзяць у інтэрнаце сустрэчы з цікавымі людзьмі. Гэта, дарэчы, на карысць як журналістам, так і фізікам. Далей: адзін член студсавета ўзначальвае ЖБК, другі адказвае за спартыўную работу і г. д. Пры такой расстаноўцы сіл кожны канкрэтна ведаў бы свае абавязкі і не перакладваў іх на іншых.

Гаворачы пра абавязкі старшыні студсавета, адказная за работу ЖБК Валянціна Сташэнін падвяла вынікі дзейнасці В. Аляксеенкі, цяпер ужо былога старшыні.

Працаваў хлопец наогул з энтузіязмам, асабліва ў пачатку года. Шкада, што не заўсёды хапала яму прынцыповасці і патрабавальнасці.

Не зусім добра ішлі справы ў культурна-выхаваўчай камісіі, за якую адказваў Вячаслаў Вішнеўскі. Чым займаецца гэтая камісія?

— Праводзілі дыскатэкі,— адказвае Вішнеўскі,— амаль што кожную суботу...

Хочацца зазначыць, што на танцах, як ні на якім іншым мерапрыемстве, адчуваецца поўнае разуменне абодвух факультэтаў. Значыць, адпачываць разам могуць, а дзяжурыць, назіраць за санітарным станам — не? Вось і радыёвузел месяцы два ўсё адкрываюць... Хто тут вінаваты: журналісты ці фізікі? Напэўна, і тыя, і другія.

Цяпер пра асвятленне праблем інтэрната ў насценнай газеце (рэдактар Аляксандр Слабадчук). Хоць газета і заняла другое месца ў конкурсе насценгазет інтэрнатаў, узровень яе афармлення і зместу не вельмі высокі.

І яшчэ, не хацелася б рабіць з мухі слана, але хваляванне падпісчыкаў, якія не атрымліваюць газеты, заслугоўвае ўвагі. Чаму б дзяжурнаму па паверсе ў пэўны час не забраць патрэбную колькасць газет і не разнесці падпісчыкам?

Спартыўная работа. Загадчык спартыўнага пакоя Валерый Жураўскі чамусьці маўчыць. Можа, баіцца сказаць, што яго пакой марыць бачыць сябе ў лепшым выглядзе? Літаральна ў гэтыя дні праходзіць спартакіяда паміж інтэрнатамі. Які ўдзел прыме інтэрнат? Пытанне пакуль без адказу.

Як бачыце, справы не вельмі добрыя. Бясспрэчна, дзеянні абодвух прафбюро і студсавета былі разрозненыя. Ці не таму іх старшыні — Іосіф Папко (журфак) і Аляксандр Галаваты (фізфак) — на студсавеце адчуваюць сябе гасцямі?

У пастанове пасяджэння запісаны прынятыя рашэнні. Хочацца верыць, што новы старшыня Валерый Багіян (фізфак) зможа актывізаваць работу студсавета і адказаць справай на ўсе пастаўленыя пытанні.

**В. МАРЧУК,**
**старшыня прэс-цэнтра прафкома.**

ФОТАРЭПАРТАЖ

# БУДНІ ПАДРЫХТОЎЧАГА



ТРЫ МЕСЯЦЫ назад нас яшчэ зусім нічога не аб'ядноўвала. Сёння мы — з'яднаны, дружны калектыў з багатым грамадскім жыццём, са сваімі клопатамі, марамі і адзінай мэтай — стаць паўнапраўнымі членамі студэнцтва БДУ імя У. І. Леніна. Будучыя хімікі, фізікі, гісторыкі, філолагі, географы і журналісты ўжо цяпер у самай гушчыні універсітэцкага жыцця. Яны прымаюць актыўны ўдзел у суботніках, спартыўных спаборніцтвах, выпускаюць насценгазету «Пачатак», наведваюць музеі, кіно і тэатры, розныя выстаўкі. Хочацца ўсё ведаць і ўсё бачыць. Зараз на ПА ідзе падрыхтоўка да прадстаячай работы ў студэнцкіх будаўнічых атрадах. Бо кожны ж навучэнец у сваім асабістым комплексным плане напісаў: «Прыняць удзел у СБА 1982 года».



Якіх розных па характарах, інтарэсах, узросту і прафесіях людзей сабралі аўдыторыі падрыхтоўчага аддзялення! Большасці слухачоў у сярэднім 20 гадоў, але ёсць і такія, якім па 25 і нават па 30. Нядаўна ў нас прайшла камсамольская атэстацыя. Яна стала своеасаблівым падвядзеннем вынікаў вучобы і грамадскага жыцця «нулявога» курса, бо праз тры месяцы вырашыцца самае асноўнае для кожнага з нас пытанне — быць ці не быць студэнтам.





**А. ВАЛОШЫН,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

**НА ЗДЫМКАХ:** ідзе атэстацыя; суботнік; выпуск насценгазеты; фізпадрыхтоўка.

Фота **аўтара.**

# ЗНОЎ ПЕРАМОЖЦЫ

НА РАСШЫРАНЫМ пасяджэнні савета маладых вучоных і спецыялістаў ЦК ЛКСМ Беларусі з дакладам «Аб удасканаленні работы саветаў маладых вучоных і спецыялістаў рэспублікі ў святле патрабаванняў XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда Кампартыі Беларусі» выступіў старшыня савета маладых вучоных і спецыялістаў ЦК ЛКСМБ доктар медыцынскіх навук Я. Ф. Канапля.

Былі абмеркаваны пытанні па ўдасканаленню арганізацыйных прынцыпаў кіраўніцтва саветаў маладых вучоных і спецыялістаў, фарміраванню ідэйнай перакананасці і камуністычнай свядомасці навукова-тэхнічнай моладзі, павышэнню прафесійнай кваліфікацыі маладых вучоных і спецыялістаў, прыцягненню студэнцкай моладзі да паскарэння тэмпаў навукова-тэхнічнага прагрэсу і развіццю навукова-тэхнічнай творчасці школьнікаў, арганізацыі шэфства над комплекснымі мэтавымі навукова-тэхнічнымі праблемамі і комплекснымі творчымі маладзёжнымі калектывамі.

Акрамя таго, на пасяджэнні былі падведзены вынікі рэспубліканскага агляду-конкурсу работы саветаў маладых вучоных і спецыялістаў у 1981 годзе. Савет маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна трэці раз запар прызнаны пераможцам сярод саветаў маладых вучоных і спецыялістаў ВНУ рэспублікі.

**Т. ДАНІЛЕНКА,**
**малодшы навуковы супрацоўнік кафедры фізікі паўправаднікоў, член савета маладых вучоных і спецыялістаў ЦК ЛКСМБ.**

● З НАШАЙ ПОШТЫ ●

# ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

НЯДАЎНА на філалагічным факультэце адбылася сустрэча з вядомай беларускай паэтэсай Яўгеніяй Янішчыц. На гэты раз яна прыйшла да нас не толькі як паэт, але і як грамадскі дзеяч. Тры месяцы правяла Я. Янішчыц ў Нью-Йорку, дзе ў саставе беларускай дэлегацыі прымала ўдзел у рабоце XXXVII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

Мы пачулі ад паэтэсы расказ аб яе жыцці і рабоце. Свой першы верш яна напісала у дванаццацігадовым узросце і прысвяціла маці. Яўгенія Янішчыц з усмешкаю ўспамінае гэты першы твор, бо бацька пацікавіўся: «Можа, спісала адкуль?»

Яна друкавалася ў раённай газеце «Палеская праўда». А пасля заканчэння школы паступіла ў БДУ на філалагічны факультэт. Яўгенія была членам літаб'яднання «Узлёт», добра вучылася — атрымлівала стыпендыю імя Я. Купалы.

Яна многа і плённа працуе. І ўжо на пятым курсе выдае першы паэтычны зборнік.

Зараз у Яўгеніі Янішчыц ужо чатыры паэтычныя зборнікі. У будучым годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйдзе новая кніга беларускай паэтэсы.

З цікавасцю слухалі студэнты расказ аб Амерыцы, аб сустрэчах там, за мяжой, аб рабоце сесіі ААН.

**І. ВЕРАМЕЙ,**
**студэнтка філфака, слухачка аддзялення журналістыкі ФГП.**

# У добры шлях, фізкультурная пауза!

«ЛЕПШ ДРЭННА ЕХАЦЬ, ЧЫМ ДОБРА ІСЦІ». — гаворыць народная мудрасць. А сацыялагічныя даследаванні, між іншым, сведчаць аб тым, што рухомая актыўнасць сучаснага сярэдняга навучэнца ВНУ не адпавядае ўстаноўленым нормам (10—12 гадзін у тыдзень як мінімум).

Далёка не суцяшальнымі аказаліся і лічбы, узятыя па БДУ: 10—12 працэнтаў студэнтаў 1—2 курсаў наведваюць заняткі лячэбнай фізкультуры. Такія лічбы не могуць не непакоіць. Іменна яны і прымусілі выкладчыкаў кафедры фізкультуры і спорту Белдзяржуніверсітэта распрацаваць шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне здароўя студэнтаў. Сярод іх — увядзенне з 1 красавіка на ўсіх факультэтах БДУ фізкультурнай паузы.

Гэта значыць, што кожны дзень апошнія 5 хвілін другой гадзіны другой пары адведзены студэнтам для выканання пэўнага комплексу фізічных практыкаванняў.

Што дадуць гэтыя 5 хвілін і ці мае сэнс такое новаўвядзенне? Даследаванні, праведзеныя кафедрай фізкультуры і спорту, паказалі, што мае. Дзякуючы пяці-шасці выкананым практыкаванням прыток крыві да мозгу значна павялічваецца і ў канчатковым выніку выклікае за сабой паляпшэнне засваення інфармацыі.

А вось да якога цікавага вываду прыйшоў кандыдат педагагічных навук Уладзімір Міхайлавіч Рэйзін, які правёў некалькі эксперыментальных масавых фізічных пауз на розных факультэтах: «Найбольшы ўплыў на павелічэнне працаздольнасці аказваюць практыкаванні ізаметрычныя (напружанасць мышцаў без руху)».

Даследванні У. М. Рэйзіна ставілі сваёй мэтай вызначэнне самага аптымальнага комплексу практыкаванняў. Цяпер гэты комплекс прапаноўваецца інструктарам па правядзенню фізкультпаузы на семінарах.

Ці прыжывецца ва універсітэце фізкультурная пауза?

— Хацелася б, каб прыжылася, — гаворыць Уладзімір Міхайлавіч. — Хацелася б, каб студэнты падышлі да гэтага мерапрыемства з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю. Кожны скептык павінен зразумець, што без фізкультуры, без рэгулярных трэніровак немагчыма сёння актыўнае жыццё чалавека разумовай працы.

**Л. МАЛАШЭНЯ,**
**студэнтка журфака.**

● **КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ**

# ДАПАМАГАЕ ДРУЖБА

ІХ З'ЯДНАЛА падрыхтоўчае аддзяленне. Яны прыехалі ў Мінск з розных куткоў не толькі нашай рэспублікі, але і ўсёй краіны. За іх плячыма была праца на заводах, фабрыках, у калгасах і саўгасах, а ў юнакоў яшчэ і армейская служба. І яшчэ ў іх была агульная мэта: раскрыць таямніцы цудоўнай і, бадай, самай сучаснай навукі — радыёфізікі.

Некалькі месяцаў вучобы на ПА былі сапраўдным выпрабаваннем на чалавечую годнасць, на права звацца студэнтам ВНУ, на ўменне жыць інтарэсамі калектыву.

Цяпер былыя выхаванцы падрыхтоўчага аддзялення — студэнты першага курса факультэта радыёфізікі і электронікі. У агульным калектыве першакурснікаў іх вылучае большая самастойнасць, упэўненасць у сабе. І яшчэ дружба, вялікая і моцная.

У інтэрнацкім пакоі, дзе жывуць чацвёра былых «пэашнікаў» — Эдуард Валатковіч, Іван Ціханаў, Сяргей Сенажэнка і Слава Мохаў — збіраюцца па вечарах даўнія сябры. Паглядзець тэлевізар, паспрачацца, паслухаць гітару... І мінчане Ігар Бучацкі і Ліна Плецікас пасля заняткаў надоўга затрымліваюцца ў восьмым інтэрнаце. А Галіна Шапялевіч ніколі не адмовіць у просьбе нешта зашыць або звязаць хлопцам. Дзяўчат на курсе нямнога. Таму і павага да іх асаблівая...

Не так даўно студэнты з мехмата запрасілі да сябе на сустрэчу КВЗ першакурснікаў-радыёфізікаў. Часу для падрыхтоўкі было мала. Але здолелі выступіць паспяхова і нават перамаглі. Асабліва спадабалася гледачам дамашняе заданне радыёфізікаў: рок-опера аб студэнцкім жыцці, якую напісаў з дапамогай сяброў Вова Максімкоў. І доўга потым дзяліліся ўражаннямі, абмяркоўвалі перамогу, успаміналі ўзнагароду за яе — вялізны торт.

Яшчэ больш згуртавала сяброў першая сесія. Не ўсім аднолькава пашанцавала на ёй. І ўсё ж не засмучаліся. Ведалі, што на памылках вучацца. І вучыліся.

Былыя выхаванцы падрыхтоўчага не стаяць у баку ад грамадскай работы. Ігар Бучацкі — староста і душа першага курса. Заўсёды вясёлы, жыццярадасны, ён у любы момант падтрымае добрым жартам, дасць карысную параду. І самы сумны настрой прападзе, і ўжо весела смяешся разам з Ігарам.

Другі Ігар — Сычоў — на падрыхтоўчым аддзяленні быў камсоргам. Цяпер ён староста адной з акадэмічных груп. Але яго па звычцы ўсё клічуць «камісарам».

Ірына Келіна і Ліна Плецікас у камітэце камсамола факультэта адказныя за інтэрнацыянальную работу. Дзяўчаты наладзілі сувязі з замежнымі студэнтамі факультэта журналістыкі. Праводзяць сумесныя сустрэчы, гутаркі, экскурсіі.

Галіна Шапялевіч — кіраўнік прэс-цэнтра прафбюро. Актыўны ўдзел у рабоце прафсаюзнага бюро прымае таксама Эдуард Валатковіч. Яму і Івану Ціханаву часта даручаюць афармляць наглядную агітацыю. Хлопцы робяць усё ўмела, па-майстэрску.

Хутка закончыцца навучальны год. Але першакурснікі не развітаюцца, яны і летам будуць разам. Амаль усе едуць працаваць у саставе будаўнічых атрадаў у раёны Мінскай вобласці. У Клецкім раёне, напрыклад, будзе дыслакавацца інтэратрад «Сірыус». Яго камандзір — Ігар Бучацкі, камісар — Ірына Келіна, майстар — Міраслаў Вараноўскі. Усе — былыя выхаванцы ПА. І ў саставе байцоў будатрада большасць іх: Сяргей Мікуліч, Ніна Паваркова, Галіна Шапялевіч...

Яны разам вучацца, разам адпачываюць, разам прымаюць удзел у грамадскай рабоце. Няхай і ў далейшым дружба дапамагае ім пераадольваць нягоды на цярністым, але такім прывабным шляху студэнцкага жыцця.

**Н. ШЧАЛКАНОГАВА,**
**студэнтка журфака.**

# НА КРУТЫХ ВІРАЖАХ

**Група турыстаў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі зрабіла лыжнае турысцкае падарожжа III катэгорыі складанасці па Кольскаму паўвостраву, па Хібінскай і Лавазёрскай тундрах. За 11 дзён намі пройдзена больш чым 200 км, мы падняліся на 6 перавалаў. І галоўнае, кожны з нас набыў яшчэ 9 верных і надзейных сяброў.**

**7 сакавіка. 11.45.** Прывал. Здымаем рукзакі, садзімся на іх. Размінаем зацёкшыя пад лямкамі плечы, жартуем, азіраемся навокал. Справа і злева чорныя, прыпарушаныя сняжком скалы. Ні дрэўца, ні кусціка — усё гэта засталося ўнізе, у даліне ракі Тавайок. Мы яе ўжо не бачым, таму што павярнулі ўлева, і каменны уцёс схаваў ад нас і лес, і белую палосачку Умбвозера, і перавал Паўночны Партамчор, які мы прайшлі ўчора. А прама перад намі круты схіл з каменнямі, якія тырчаць з-пад снегу,— гэта і ёсць перавал Паўночны Тавайок. Уласна, перавальнай седлавіны няма, гэта проста зручны пад'ём на плато. З процілеглага боку такая ж цясніна, куды нам і трэба.

— А ці не пара нам? — бярэцца за лямку рукзака Юра, самы малады і нецярплівы. Павольна пачынаем рух. Спачатку ідзём звычайна, потым «лесвічкай». Глядзіш толькі на лыжы таго, хто ідзе перад табой, сочыш, каб не зачапіць іх сваёй лыжай. Думаць і глядзець па баках не хочацца, хаця пад'ём не вельмі цяжкі — аднастайнасць руху прытупляе ўспрымальнасць навакольнага. Фатаграфуемся і спяшаемся ўніз, падганяемыя ветрам. Пачынаецца самае прыемнае ў лыжным паходзе — спуск. Варта павольна і доўга ўзбірацца на перавал, каб адчуць, няхай ненадоўга, асалоду скараснога спуску, які падобны на палёт. На шчыльным схіле лыжы імгненна набіраюць скорасць, і вось ужо вецер выдзімае слёзы з вачэй, зрывае з галавы капішон штармоўкі, свісціць у вушах. У такія хвіліны хочацца спяваць і крычаць ад паўнаты адчуванняў.

Застругі ўсё больш падкідваюць мяне, нягледзячы на рукзак. Для ўстойлівасці прыйшлося трымацца за лыжныя палкі. Тармажу імі з усіх сіл, але тут спуск амаль без пераходу змяняецца палётам: лыжы ўехалі ў мяккі сугроб, і я, праляцеўшы па інерцыі яшчэ некалькі метраў, акунаюся ў яго галавой. Падняўшыся на ногі, абтрасаюся, назіраю за рабятамі. Лыжнікі рассыпаліся па схілу, едуць серпантынам, таму здаецца, што яны рухаюцца хто куды, як броўнаўскія часцінкі. На паваротах і пры тармажэнні за кожным вырастае снежны шлейф, а пры падзенні ўзнімаецца цэлае воблака пушыстага снегу.

Аднак надвор'е нас не песціць. Вецер узмацніўся, ён ужо не свішча, а вые; зазмяілася ля ног завея; застукала па капішонах снежная крупа. Добра яшчэ, што ў спіну, і ўдвайне добра, што на спуску. Мы ўжо ў вузкім каньёне ручая Мурувай. Тут з дарогі не саб'ешся — толькі ўніз, але каньён ператварыўся ў аэрадынамічную трубу. Снежныя парывы налятаюць з усіх бакоў, валяць з ног, кідаюць у твар снежныя зарады. Няўжо пурга? Ды не, як у насмешку, над намі праглядае блакітнае неба. Гэта проста вецер падняў снег са схілаў, і гэта завея (якая мае вышыню метраў 20) цалкам перакрывае нашу цясніну.

«Уніз!» — адзіная думка. Усё астатняе выдзьмута ветрам. Ён пранізвае камбінезон і світэр з такой лёгкасцю, быццам іх няма зусім. Здымаем лыжы, якія амаль не трымаюць на пакрытым ільдом схіле, і пешшу працягваем скідваць вышыню — атрымліваецца значна хутчэй.

Нарэшце, чорныя сцены разышліся, снег стаў прывычным, ужо тырчаць з-пад ног вяршыні першых кустоў. Вецер застаўся ўверсе. Адсюль бачна, як ён узнімае на грэбнях снежныя сцягі. Яшчэ некалькі мінут, і мы на ўтульнай палянцы, сярод крывых бяроз. Аглядваем адзін аднаго, прыслухоўваемся да сябе: нос? вушы? шчокі? рукі? ногі? Ну, выдатна — ніхто нічога не адмарозіў, толькі прамерзлі, здаецца, да касцей. Нацягваем на сябе ў каго што ёсць — ватныя, пуховыя, футравыя курткі.

— Дзіўны народ гэтыя турысты: калі холадна было—не апраналіся, а калі стала цяплей — адразу апрануліся, — Юрын жарт пакрывае дружны смех. Дастаём тэрмасы з гарачым чаем, сала, сухары, цыбулю. Гляджу на гадзіннік — прайшло ўсяго дзве гадзіны сорак пяць мінут з таго моманту, як мы пачалі пад'ём на перавал. Схамянуўшыся, крычу:

— Таварышы ўдзельнікі! Віншую вас з пераадоленнем перавала Паўночны Тавайок!

Замест «ура» чутны крыкі:

— А шакалад? Дзе перавальны шакалад?

Дзелім на дзесяць частак шаакаладку — мы яе сёння сумленна зарабілі.

Да хаткі, дзе ў нас запланавана начоўка, засталося 8 км.

Уніз вядзе свежая накатаная лыжня. Пачынаецца «турысцкі слалам» з рукзаком. Трэба паспяваць прысядаць, выстаўляць наперад рукі, каб адхіліцца ад удараў галінак. Трэба змагчы ўпісацца ў паварот, каб не «збіць» елку. Вылятаю на скорасці з-за паварота і, ацаніўшы сітуацыю, падаю ў снег. Прама на лыжні стаіць Дзіма, абняўшы елку, а побач валтузіцца ў снезе Света, таксама паспеўшая ўпасці, каб не ўрэзацца ў Дзіму. Рыхлы снег забівае нават прастору паміж акулярамі і вачыма, але гэта не псуе нам настрой, і мы весела смяемся.



Выкатваемся на лёд Сейдвозера. Над ім узвышаецца скала, якая крышку нагадвае чалавечую галаву. У даўнія часы і гэта скала, і возера лічыліся свяшчэннымі ў карэнных жыхароў Кольскага паўвострава. Навакольны пейзаж суровы і таямнічы. Крутыя схілы плато, якія шчыльна падступаюць да возера, зрэзаныя каньёнамі ручаёў, маюць выгляд бастыёнаў, башняў, фантастычных галоў. Развяваюцца над імі снежныя сцягі, праносяцца хуткія, вузкія, як шаблі, хмары. Выліняы блакіт неба мякка пераходзіць ля гарызонта ў шэрыя з ружовым адценнем таны, як на карцінах Ракуэла Кента. Мы, не спяшаючыся, рухаемся па льду возера, глядзім па баках, фатаграфуем.

Падыходзім да хаткі, зробленай архангельскімі турыстамі ў памяць аб сваіх загінуўшых таварышах. Аб іх напамінае мемарыяльная дошка, прымацаваная ля дзвярэй, аб іх расказваецца ў сшытку, які тут захоўваецца. У сшытку па традыцыі распісваюцца ўсе групы. Цікава пагартаць гэтыя старонкі, спісаныя людзьмі з розных куткоў нашай краіны, прыемна таксама сустрэць знаёмыя прозвішчы мінчан.

Распальваем печ, адаграваемся, пачынаем рыхтаваць святочнае снеданне — заўтра свята, і мы будзем віншаваць нашых трох дзяўчат. Заўтра ў нас днёўка — дзень адпачынку, а потым нам зноў размотваць нітку лыжні, паднімацца на перавалы, круціць віражы на спусках. І нават калі паход будзе скончаны і мы сядзем у поезд, наперадзе нас будуць чакаць новыя перавалы, новыя маршруты, новыя сустрэчы...



Але ўсё гэта будзе яшчэ не скора. А пакуль, як пяецца ў турысцкай песні: «пляшут тени на лицах ребят, и гитара негромко звучит»...

**К. САЛАК,**
**інжынер НДІ ПФП,**
**кіраўнік паходу.**
Фота аўтара.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

29 красавіка 1982 г.

АТ 15256 Заказ 871.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ